83.3(4Бел)
З-30

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.09. (043.3)

ЗАПАРТЫКА
Жанна Вацлаваўна

# ПРОЗА "УЗВЫШША" ЯК ЭСТЭТЫЧНАЯ СІСТЭМА ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІМ КАНТЭКСЦЕ ("ПЕРЕВАЛ", ВАПЛІТЕ)

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Мінск, 2009

83.3(4Бел)6я031 + 83.3(4Бел)я031
З-30

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік — **Навуменка Павел Іванавіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Афіцыйныя апаненты: — **Мушынскі Міхаіл Іосіфавіч**, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела тэксталогіі і выданняў Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі

**Васючэнка Пётр Васільевіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры УА "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт"

*20504061*

Апаніруючая арганізацыя — УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны"

Абарона адбудзецца 24 красавіка 2009 года ў 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 227-63-78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы "16" сакавіка 2009 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый — Хмяльніцкі М.М.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў (з моманту вяртання ў літаратурны кантэкст) "Узвышша" неаднойчы станавілася прадметам пільнай увагі беларускіх літаратуразнаўцаў, што тлумачыцца унікальнасцю мастацкага вопыту і літаратурнай практыкі гэтага згуртавання. Аднак абсалютная большасць прац (артыкулы, раздзелы манаграфій, дысертацыйныя даследаванні) былі прысвечаны альбо аналізу эстэтычных канцэпцый, распрацаваных А. Бабарэкам, альбо творчасці асобных пісьменнікаў. Калі паэзія "Узвышша" характарызавалася некаторымі навукоўцамі як цэласная мастацкая сістэма, то ў дачыненні да прозы такіх даследаванняў не рабілася, нягледзячы на тое, што яна мае відавочныя тыпалагічныя прыкметы эстэтычнага адзінства. Пры гэтым само "Узвышша" традыцыйна ўспрымаецца як ідэйна-эстэтычнае цэлае, у якім мастацкая практыка суадносіцца з тэарэтычнымі распрацоўкамі, што не адпавядае рэальнаму стану рэчаў: такім адзінствам гэта згуртаванне ніколі не вызначалася.

У дысертацыі ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве праводзіцца аналіз сапраўднага ўплыву заяўленых у якасці асноўных творчых прынцыпаў "Узвышша" паняццяў "аквітызму" і "аквітычнай творчасці" на мастацкую практыку і сцвярджаецца канцэпцыя згуртавання як асяродку розных эстэтычных поглядаў. Гэта адлюстравалася ў наяўнасці ўнутранай палемікі на старонках часопіса "Узвышша", якая, аднак, не займела непасрэднага выражэння і выяўлялася на ўзроўні мастацкіх твораў, а не праз крытычныя выступленні. На аснове архіўных матэрыялаў, значная частка якіх упершыню ўведзена ў навуковы ўжытак, пераасэнсоўваецца гісторыя ўзнікнення "Узвышша" і роля асобных пісьменнікаў у яго стварэнні. У сувязі з гэтым з'явілася магчымасць больш дэталёвага і канцэптуальнага вывучэння прозы "Узвышша" як эстэтычнай сістэмы.

Неабходнасць аналізу ўсходнеславянскага кантэксту, правядзенне паралеляў паміж "Узвышшам" і расійскай садружнасцю пралетарскіх пісьменнікаў "Перевал" і ўкраінскім ВАПЛІТЕ (Вільна академія пролетарської літератури), абумоўлена тым, што агульныя тэндэнцыі развіцця літаратурнага, а таксама культурнага і грамадска-палітычнага працэсаў абумовілі шэраг падобных рыс у творчых праграмах і мастацкай практыцы названых аб'яднанняў. Гэтая акалічнасць да нашага часу атрымала толькі канстатацыю і кароткія характарыстыкі творчасці асобных беларускіх і рускіх, беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў. Правядзенне паралеляў паміж творчымі праграмамі і мастацкімі канцэпцыямі пісьменнікаў "Узвышша", "Перевала", ВАПЛІТЕ дазволіла надаць вывучэнню ўсходнеславянскага кантэксту беларускай літаратуры 1920-х – першай паловы 1930-х гг. сістэмны характар.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне непасрэдна звязана з распрацоўкай і выкананнем планавых і навуковых тэм Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ: “Канцэптуальныя асновы беларускай літаратуры XX стагоддзя як цэласнага гісторыка-культурнага перыяду” (2003 – 2005 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны № 20011936, ф № 615/96), “Гісторыка-літаратурны вопыт XX стагоддзя і перспектывы развіцця беларускай літаратуры” (2006 – 2010 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны № 20061802).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта даследавання – раскрыць агульныя творчыя прынцыпы прозы “Узвышша” як эстэтычнай сістэмы ў суаднесенасці з літаратурна-тэарэтычнымі і мастацкімі пошукамі ў рускай і ўкраінскай літаратурах 1920-х – першай паловы 1930-х гг. на прыкладзе аналізу творчых праграм і мастацкіх твораў літаратурных аб’яднанняў “Перевал” і ВАПЛІТЕ.

Для рэалізацыі мэты ставіліся наступныя **задачы**:

- прасачыць перадумовы фарміравання асноўных рыс прозы “Узвышша” ў працэсе адмаўлення творчай мадэлі “Маладняка”;
- выявіць тыпалагічнае падабенства творчых праграм літаратурных аб’яднанняў “Узвышша” (Беларусь), “Перевал” (Расія), ВАПЛІТЕ (Украіна);
- прааналізаваць палажэнні тэарэтычнай платформы згуртавання “Узвышша”, адлюстраваныя ў літаратурна-крытычных працах Адама Бабарэкі, Язэпа Пушчы, Антона Адамовіча, а таксама ў праграмных дакументах;
- правесці параўнальны аналіз канцэпцый, выяўленых у тэарэтычных працах і мастацкіх творах “Узвышша”;
- вылучыць асноўныя рысы прозы “Узвышша” на аснове аналізу празаічных твораў Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Лукаша Калюгі, Андрэя Мрыя ўзвышаўскага перыяду, якія сфарміраваліся ў палеміцы з дамінуючымі літаратурнымі ўстаноўкамі 1920-х – першай паловы 1930-х гг.

**Аб’ектам** даследавання з’яўляюцца мастацкія, тэарэтычныя, літаратурна-крытычныя і літаратуразнаўчыя працы членаў літаратурна-мастацкага згуртавання “Узвышша”, а таксама артыкулы тэарэтыкаў і мастацкія творы пісьменнікаў рускай садружнасці пралетарскіх пісьменнікаў “Перевал” і ўкраінскага аб’яднання ВАПЛІТЕ.

**Прадметам** дысертацыйнага даследавання выступае проза беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання “Узвышша” як эстэтычная сістэма ва ўсходнеславянскім кантэксце.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша" як эстэтычная з'ява паслядоўна і заканамерна сфарміравалася ўнутры Усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк" у працэсе адмаўлення маладнякоўскай мастацкай практыкі, асноўнымі рысамі якой былі ігнараванне творчай індывідуальнасці, павярхоўнасць і схематычнасць у адборы мастацкага матэрыялу, арыентацыя на адцягненую ідэю, адмаўленне актуальнасці мастацкага адлюстравання вясковай праблематыкі, адсутнасць распрацаваных эстэтычных крытэрыяў.

2. Беларускае літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша", руская садружнасць пралетарскіх пісьменнікаў "Перевал", украінская ВАПЛІТЕ прайшлі падобныя шляхі эстэтычнага станаўлення і адлюстравалі не толькі агульнасць заканамернасцей літаратурнага развіцця ва ўсходнеславянскіх літаратурах, але і заканамернасці самарэгулявання літаратурнага руху ўвогуле. Можна вылучыць наступную агульную для трох усходнеславянскіх літаратур заканамернасць развіцця: з аб'яднанняў, скіраваных на культурна-асветніцкую працу сярод моладзі з мэтай прыцягнення іх да камуністычнай ідэалогіі ("Маладняк" у Беларусі, РАПП у Расіі, "Плуг" на Украіне) паступова вылучылася кола пісьменнікаў (адпаведна "Узвышша", "Перевал", "ВАПЛІТЕ"), нязгодных з атаясамленнем мастацкай функцыі літаратуры з грамадскай, абсалютызацыяй ідэалагічнага моманту, адсутнасцю прафесійнага падыходу ў пытаннях літаратурнай крытыкі і прафесійнай падрыхтоўкі пісьменнікаў.

3. Паняцці "аквітызму" і "аквітычнай творчасці", прапанаваныя Адамам Бабарэкам і Язэпам Пушчам у якасці вызначэння асноўнага мастацкага прынцыпу творчасці пісьменнікаў-узвышаўцаў, не атрымалі дэталёвай распрацоўкі і канкрэтызацыі, а таму не мелі вызначальнага ўплыву на развіццё мастацкіх пошукаў прозы "Узвышша". Гэтыя тэарэтычныя паняцці ўяўлялі сабой толькі абагуленыя характарыстыкі адметнай творчай праграмы, у той час як эстэтычныя прынцыпы ўзвышаўскай прозы фарміраваліся ў працэсе адмаўлення маладнякоўскай творчай мадэлі і пераасэнсавання спадчыны нашаніўства.

4. Літаратурна-мастацкае згуртаванне "Узвышша" не было цэласнай, аднароднай эстэтычнай з'явай, паколькі мастацкая проза і літаратурная крытыка "Узвышша" развіваліся ў розных напрамках. Мастацкія канцэпцыі героя і рэчаіснасці, выяўленыя ў празаічных творах Кузьмы Чорнага, Кандрата Крапівы, Лукаша Калюгі, Андрэя Мрыя ўзвышаўскага перыяду, не супадалі з асноўнымі палажэннямі тэарэтычнай платформы "Узвышша", выяўленай у працах Адама Бабарэкі, Язэпа Пушчы,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Антона Адамовіча, што сведчыла пра наяўнасць ва "Узвышшы" дзвюх сістэм поглядаў на развіццё літаратурнага працэсу. Першая, адлюстраваная ў літаратурна-крытычных і тэарэтычных працах, заключалася ў наступным: галоўнай задачай беларускай літаратуры з'яўляецца ўваходжанне ў агульнаеўрапейскі кантэкст, дасягнуць чаго можна шляхам адмаўлення ад вясковай тэматыкі як вузкай, правінцыйнай і не здольнай паўнавартасна прадстаўляць Беларусь; шляхам удасканалення і разнастайвання спосабаў фармальнага выяўлення, эстэтычных правакацый і эксперыментаў. Другая, закладзеная ў тэкстах мастацкай прозы, прыярытэтным шляхам развіцця беларускай літаратуры прызнавала асэнсаванне і адлюстраванне сучаснага стану грамадства, сацыяльна-побытавых і маральна-псіхалагічных працэсаў на пераходным этапе (вайна, рэвалюцыя, калектывізацыя), што дазволіць стварыць канцэпцыю нацыянальнага характару як аснову далейшага плённага развіцця літаратуры.

5. Мастацкая проза "Узвышша", прадстаўленая творамі Кузьмы Чорнага, Лукаша Калюгі, Кандрата Крапівы, Андрэя Мрыя, уяўляе сабой эстэтычную сістэму з агульнымі мастацкімі прынцыпамі, якія можна ахарактарызаваць наступным чынам: абранне ў якасці асноўнага мастацкага матэрыялу жыццёвай канкрэтыкі свайго часу; аналітычны падыход да адбору мастацкага матэрыялу; асноўная сэнсавая нагрузка падтэксту пры адсутнасці прамых аўтарскіх характарыстык і каментарыяў; арыентацыя на коласаўскі прынцып пераводу адлюстравання побыту з узроўню мастацкай дэталі на ўзровень мастацкай канцэпцыі; актуалізацыя вясковай праблематыкі на новым жыццёвым матэрыяле шляхам яе мадэрнізацыі і лакалізацыі.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя ў поўным аб'ёме выканана аўтарам самастойна, без сааўтараў на аснове пашырэння даследчай базы за кошт увядзення новага або малавядомага фактычнага матэрыялу, звязанага з гісторыяй утварэння і дзейнасцю беларускага літаратурна-мастацкага згуртавання "Узвышша", а таксама яго тыпалагічных сувязей з рускім і ўкраінскім літаратурнымі аб'яднаннямі "Перевал" і ВАПЛІТЕ. У пазначаным кірунку проза "Узвышша" даследавана ўпершыню.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя палажэнні асвятляліся ў дакладах і паведамленнях на міжнародных навуковых канферэнцыях: "Мова – Літаратура – Культура" (Мінск, 16-17 лістапада 2006 г.), "Нацыянальнае і агульначалавечае ў літаратурах славянскіх народаў" (Гомель, 19-21 верасня 2007 г.), "Янка Купала і Якуб Колас у сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя" (Мінск, 26-27 верасня 2007 г.), "Славянскія

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ
літаратуры ў кантэксце сусветнай" (Мінск, 1-3 лістапада 2007 г.), "Нацыянальнае, рэгіянальнае і агульначалавечае ў літаратуры" (Гомель, 1-3 кастрычніка 2008 г.); рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях: VI Узвышаўскія чытанні, прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі і 80-годдзю з часу ўтварэння літаратурнага аб'яднання "Узвышша" (Мінск, 26 мая 2006 г.), VII Узвышаўскія чытанні, прысвечаныя 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і літаратурным аб'яднанням 1920-х гг. (Мінск, 28 мая 2007), VIII Узвышаўскія чытанні, прысвечаныя Андрэю Мрыю і праблемам фарміравання беларускай літаратурнай мовы (Мінск, 26 мая 2008 г.), V Архіўныя чытанні, прысвечаныя 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа (Мінск, 4 кастрычніка 2007 г.).

**Апублікаванасць вынікаў**

Асноўныя матэрыялы даследавання адлюстраваны ў 15 публікацыях: 4 артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (1,6 аўтарскага аркуша), 6 артыкулаў у навуковых зборніках і энцыклапедыі (1,9 аўтарскага аркуша), 5 матэрыялаў выступленняў на навуковых канферэнцыях (1,3 аўтарскага аркуша). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,8 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі, трох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц (212 пазіцый). Асноўны тэкст займае 102 старонкі, са спісам літаратуры – 118 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **"Уводзінах"** абгрунтоўваецца выбар дысертацыйнай тэмы і яе актуальнасць, даецца характарыстыка папярэдніх даследаванняў, падкрэсліваецца, што праблема, вынесеная ў назву працы, да гэтага не была прадметам аналізу. Сцвярджаецца неабходнасць пераасэнсавання ўсталяванай канцэпцыі літаратурна-мастацкага згуртавання "Узвышша" як эстэтычнай цэласнасці і больш дэталёвага разгляду яго тыпалагічных сувязей з рускім літаратурным аб'яднаннем "Перевал" і ўкраінскім ВАПЛІТЕ.

У першай главе **"Эстэтычны феномен "Узвышша" ва ўсходнеславянскім кантэксце"** аналізуецца працэс фарміравання творчай платформы "Узвышша" ў выніку развіцця аб'ектыўных заканамернасцей літаратурнага руху 1920-х гг. у суаднесенасці з адпаведнымі тэндэнцыямі ў рускай і ўкраінскай літаратурах.

У раздзеле **1.1. "Узвышша" і "Маладняк": станаўленне альтэрнатыўнай мастацкай мадэлі"** характарызуюцца найбольш слабыя бакі мастацкай практыкі літаратурнага аб'яднання "Маладняк", насуперак

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК


1. Капуста (Запартыка), Ж.В. Тыпалагічныя падабенствы ідэйна-эстэтычных прагарам літаратурных аб'яднанняў 1920-х гг. "Узвышша" і "Перевал" / Ж.В. Капуста // Весн. Белар. дзярж. ун-та. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2007. – № 1. – С. 23–28.

2. Капуста (Запартыка), Ж.В. Аб'яднанне "Маладняк": мастацкая платформа / Ж.В. Капуста // Роднае слова. – 2008. – № 6. – С. 20–23.

3. Капуста (Запартыка), Ж.В. Канцэпцыя чалавека і рэчаіснасці ў прозе і крытыцы "Узвышша" / Ж.В. Капуста // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2008. – № 6 (51). – Часть 1. – С. 85–88.

4. Капуста (Запартыка), Ж.В. Мастацкая формула згуртавання "Узвышша" / Ж.В. Капуста // Роднае слова. – 2008. – № 7. – С. 20–23.


### Артыкулы ў навуковых зборніках і энцыклапедыях


5. Гізун (Запартыка), Ж.В. Творчасць Максіма Гарэцкага ў літаратурнай крытыцы "Узвышша" / Ж.В. Гізун // Беларускае літаратуразнаўства: нав.-мет. альманах / рэд. рада: Л.Д. Сінькова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. - Вып. 1. – С. 51 – 55.

6. Гізун (Запартыка), Ж.В. Ідэйна-эстэтычныя погляды А. Бабарэкі ўзвышаўскага перыяду / Ж.В. Гізун // Беларускае літаратуразнаўства: нав.-мет. альманах / рэд. рада: Л.Д. Сінькова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – Вып. 2. – С. 111–116.

7. Капуста (Запартыка), Ж.В. Інтэрпрэтацыя паэтычнай традыцыі Янкі Купалы ў розных эстэтычных кірунках 1920-х гг. / Ж.В. Капуста // Міфалогія-фальклор-літаратура: Праблемы паэтыкі. – Мінск, 2007. – Вып. 5. – С. 60–66.

8. Гізун (Запартыка), Ж.В. Навелістыка Лукаша Калюгі як узор узвышаўскай літаратурнай палемікі / Ж.В. Гізун // Беларускае літаратуразнаўства: нав.-мет. альманах / рэд. рада: Л.Д. Сінькова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2007. – Вып. 5. – С. 55–62.

9. Капуста (Запартыка), Ж.В. Праблема рассяляньвання ў прозе Максіма Гарэцкага і Лукаша Калюгі / Ж.В. Капуста // Беларускае літаратуразнаўства: нав.-мет. альманах / рэд. рада: Л.Д. Сінькова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – Вып. 6. – С. 36–38.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

10. Капуста (Запартыка), Ж.В. Узвышша // Республика Беларусь: Энциклопедия: В 6 т. / ред. кол. Г.П. Пашков (глав. ред.) [и др.] – Минск, 2008. – Т. 7 – С. 304.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

11. Гізун (Запартыка), Ж.В. Ідэйна-эстэтычныя праграмы "Узвышша" і "Перевала": вопыт тыпалагічнага параўнання / Ж.В. Гізун // Мова – Літаратура – Культура: матэр. V Міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя прафесара Льва Міхайлавіча Шакуна), Мінск, 16-17 лістапада 2006 г. – Мінск, 2007. – С. 516–518.

12. Гізун (Запартыка), Ж.В. Літаратурнае згуртаванне "Узвышша" як асяродак розных ідэйна-эстэтычных кірункаў / Ж.В. Капуста // Пра час "Узвышша": матэрыялы Узвышаўскіх чытанняў (Мінск. 2005–2006) / уклад. Г.В. Запартыка, Т.В. Кекелева, У.Г. Кулажанка; навук. рэд. М.І. Мушынскі. – Мінск, 2007. – Вып. 3. – С. 258-265.

13. Капуста (Запартыка), Ж.В. Пераемнасць і працяг нашаніўскай канцэпцыі нацыянальнага характару ў літаратуры "Узвышша" / Ж.В. Капуста // Нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах, міжнар. навук. канф. (2007; Гомель). Міжнародная навуковая канферэнцыя "Нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах", 19 – 20 верасня 2007 г.: прысвеч. памяці народнага пісьменніка Беларусі І. Шамякіна: матэрыялы: у 2 ч. Ч. 2 / рэдкал.: І.Ф. Штэйнер (адказ. рэд.) [і інш.] – Гомель, 2007. – С. 46–50.

14. Капуста (Запартыка), Ж.В. Уплыў творчасці Я. Коласа на фарміраванне прозы "Узвышша" / Ж.В. Капуста // Янка Купала і Якуб Колас у сістэме дзяржаўна-культурных і духоўна-эстэтычных прыярытэтаў XXI стагоддзя: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 26-27 верасня 2007 г.) / [рэдкалегія: В.А. Максімовіч (навуковы рэдактар) і інш. ] – Мінск, 2007. – С. 184–188.

15. Капуста (Запартыка), Ж.В. Літаратурныя традыцыі Я.Купалы і Я.Коласа ў творчых практыках "Маладняка" і "Узвышша" / Ж.В. Капуста // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: VIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 125-годдзю з дня нарадж. Янкі Купалы і Якуба Коласа, 1 – 3 лістап. 2007 г., Мінск, БДУ: зб. навук. арт. / рэдкал.: Т.І. Шамякіна (адк. рэд.) [і інш.]; пад агул. рэд. І.С. Роўды. – Мінск, 2008. – С. 38–42.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЭЗЮМЭ

**Запартыка Жанна Вацлаваўна**

**Проза "Узвышша" як эстэтычная сістэма ва ўсходнеславянскім кантэксце ("Перевал", ВАПЛІТЕ)**

*Ключавыя словы*: "Узвышша", "Перевал", ВАПЛІТЕ, "Маладняк", нашаніўства, беларуска-рускія і беларуска-ўкраінскія літаратурныя сувязі, падтэкст, літаратурны працэс, творчая праграма, мастацкая традыцыя, проза, крытыка, палеміка.

*Мэта дысертацыйнага даследавання* – вылучыць агульныя творчыя прынцыпы прозы "Узвышша" як эстэтычнай сістэмы ў суаднесенасці з літаратурна-тэарэтычнымі і мастацкімі пошукамі ў рускай і ўкраінскай літаратуры 1920 – першай паловы 1930-х гг. на прыкладзе аналізу творчых праграм і мастацкіх тэкстаў сяброў літаратурных аб'яднанняў "Перевал" і ВАПЛІТЕ.

*Метадалагічная аснова працы.* Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся асноўныя прынцыпы параўнальна-гістарычнага метаду даследавання і прыёмы кампаратыўнага літаратуразнаўства.

*Асноўныя вынікі і навізна.* Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем, у якім ажыццяўляецца сістэмны аналіз прозы "Узвышша" як эстэтычнай сістэмы ва ўсходнеславянскім літаратурным кантэксце 1920 – першай паловы 1930–х гг.; праводзіцца падрабязны параўнальны аналіз творчых праграм літаратурных аб'яднанняў "Узвышша" і "Перевал", "Узвышша" і ВАПЛІТЕ. Упершыню – праз сцвярджэнне супярэчнасцей паміж канцэпцыямі літаратурнага развіцця ў тэарэтычных працах і мастацкіх творах "Узвышша" – абгрунтоўваецца думка аб наяўнасці ў літаратурна-мастацкім згуртаванні "Узвышша" двух эстэтычных кірункаў.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры далейшым вывучэнні беларускай літаратуры ва ўсходнеславянскім кантэксце; тыпалагічных і кантактных сувязей усходнеславянскіх літаратур; даследаванні гісторыі беларускіх літаратурных аб'яднанняў XX ст. і заканамернасцей беларускага літаратурнага працэса першай трэці XX ст.; пры падрыхтоўцы лекцый, практычных заняткаў, спецкурсаў, прысвечаных творчасці пісьменнікаў згуртавання "Узвышша", тэарэтычных працах і практычных дапаможніках па гісторыі беларускай літаратуры XX ст.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЕЗЮМЕ

**Запартыко Жанна Вацлавовна**

### Проза "Узвышша" как эстетическая система в восточнославянском контексте ("Перевал", ВАПЛІТЕ)

*Ключевые слова*: "Узвышша", "Перевал", ВАПЛІТЕ, "Маладняк", нашенивство, белорусско-русские и белорусско-украинские литературные связи, подтекст, литературный процесс, творческая программа, художественная традиция, проза, критика, полемика.

*Цель* диссертационного исследования – определить общие творческие принципы прозы "Узвышша" как эстетической системы в соотнесении с литературно-теоретическими и художественными поисками в русской и украинской литературах 1920 – первой половины 1930-х гг. на примере анализа творческих программ и художественных текстов членов литературных объединений "Перевал" и ВАПЛІТЕ.

*Методологическая основа работы.* Для решения поставленных задач использовались основные принципы сравнительно-исторического метода и приемы компаративного литературоведения.

*Основные результаты и новизна.* Диссертация является самостоятельным исследованием, в котором осуществляется системный анализ прозы "Узвышша" как эстетического феномена в восточнославянском контексте 1920 – первой половины 1930–х гг.; проводится подробный сравнительный анализ творческих программ литературных объединений "Узвышша" и "Перевал", "Узвышша" и ВАПЛІТЕ. Впервые обосновывается мысль о существовании в литературно-художественном объединении "Узвышша" двух эстетических направлений.

Основные положения и результаты диссертационного исследования могут быть использованы при дальнейшем изучении белорусской литературы в восточнославянском контексте; типологических и контактных связей восточнославянских литератур; исследовании истории белорусских литературных объединений XX века и закономерностей белорусского литературного процесса первой трети XX века; при подготовке лекций, практических занятий, спецкурсов, посвященных творчеству писателей объединения "Узвышша", теоретических работах и практических пособиях по истории белорусской литературы XX века.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


# SUMMARY

**Zapartyka Zhanna**

**Prose "Uzvyshsha" as aesthetic system in Eastern Slavic context ("Pereval", VAPLITE)**

*Key words*: "Uzvyshsha", "Pereval", VAPLITE, "Maladnjak", nashaniustva, Belarusian-Russian and Belarusian-Ukrainian literary relations, undertone, literary process, creative program, art tradition, prose, criticism, polemics.

*Subjects of the study* — pick out common creative principles of prose of "Uzvyshsha" as aesthetic system in comparison with literary-theoretic and creative search in Russian and Ukrainian literatures of 1920 — first part of 1930-s by the example of the analyses of creative programs and literary-fiction of the members of literary unifications of "Pereval" and VAPLITE.

*Methodological base* of the work. To accomplish posed tasks were used main principles of comparative-historic method and ways of comparative literary criticism.

*Main results and novelty*. This work is an original dissertation work, in which systematic analyses of prose of "Uzvyshsha" as an aesthetic system in Eastern Slavic literary context of 1920 — first part of 1930-s was carried out; there was made a detailed comparative analyses of creative programs of literary unifications of "Uzvyshsha" and "Pereval", "Uzvyshsha" and VAPLITE; also notions of literary canon and models of literary polemics were formulated. For the first time — by the means of assertion of contradictions between the concepts of the literary development in theoretical works and literary-fiction of "Uzvyshsha" — was proved the idea of the existence of two aesthetic directions in literary-fiction unification of "Uzvyshsha".

Main theses and results of the dissertation can be used for research of the Belarusian literary in Eastern Slavic context; for typological and contact links of Eastern Slavic literatures; for the research of the history of Belarusian literary unifications of XX century and rules of Belarusian literary processes of the first third of XX century; for preparation of lectures, seminars, special courses dedicated to the creative work of the writers of "Uzvyshsha", theoretic research and practical textbooks on the history of Belarusian literature of XX century.


*20504061*